2022

*Красавік*

ДУК “ Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр
і сетка публічных бібліятэк”

# Бібліятэчны веснік














**Інфармацыйны веснік**

# *Красавік*



Дзень жартаў – свята, якое адзначаецца 1 красавіка ў многіх дзяржавах свету. Таксама любяць яго і ў нашай краіне. Бібліятэкары Гарадоцкай сеткі запрасілі ў гэты дзень да сябе маленькіх чытачоў на цікавыя мерапрыемствы: **гумарыстычны час "Жить без улыбки, просто ошибка!" (Дубраўская сельская бібліятэка), гадзіна гумару "О жизни в шутку и всерьёз" (Даўгапольская сельская бібліятэка).** Прысутныя даведаліся аб гісторыі ўзнікнення свята, традыцыях яго святкавання ў розных краінах свету, прынялі ўдзел у жартоўных віктарынах і конкурсах. У Даўгапольскай сельскай бібліятэцы ў канцы мерапрыемства адбылася для дзяцей гумарыстычная беспройгрышная латарэя, а затым чаяванне з пачастункамі.





**Даўгапольская сельская бібліятэка**

**Дубраўская сельская бібліятэка**

**1 красавіка** бібліятэкар **Межанскай сельскай бібліятэкі** запрасіла дзяцей, якія наведваюць лагер, арганізаваны пры ДУА "Межанскі дзіцячы сад – сярэдняя школа імя А.Я. Казлова" падчас школьных канікулаў на **гадзіну весялосці "Ни дня без улыбки"**, дзе ўсіх чакалі жарты і розыгрышы. Дзеці з паперы вырабілі ўсмешкі, якія размалявалі каляровымі алоўкамі на свой густ. У канцы мерапрыемства адбылася вясёлая фотасесія.





**1 красавіка** ўдзельнікі бібліятэчнага клуба “Душевный разговор”, які існуе пры Бычыхінскай сельскай бібліятэцы адбылося чарговае паседжанне – вечар гумару “Смех – дело серьёзное”. Прысутныя ўспомнілі пра гумарыста Аркадзія Райкіна, які быў аўтарам гэтых жартоўных слоў, паслухалі яго выступлення, адказалі на пытанні гумарыстыснай віктарыны. Затым у лёгкай сяброўскай атмасферы ўспаміналі смешныя выпадкі, якія адбываліся з кожным, а кіраўнік клуба расказала пра розныя жартоўныя сітуацыі, якія здараюцца ў бібліятэцы.

**1 красавіка** ў **Прудніцкай сельскай бібліятэцы** адбыўся **Дзень добрага настрою “Библиотека собирает друзей”**. Бібліятэкар вітала жыхароў вёскі Пруднікі вясёлымі гумарэскамі. На мерапрыемства былі запрошаны ўдзельнікі аўтаклуба ДУК “Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна” з музычнымі падарункамі. Жарты, вясёлыя гульні і конкурсы для дзяцей і дарослых нікому не дазволілі заставацца ў баку і аб'ядналі ўсіх удзельнікаў мерапрыемства.



**1 кастрычніка** супрацоўнікі **Бычыхінскай сельскай бібліятэкі** правялі для навучэнцаў малодшых класаў ДУА “Бычыхінская сярэдняя школа ім. І.М. Антонава” **пазнавальна-экалагічны час “Пернатый мир природы",** прымеркаваны да Міжнароднага дня птушак. Бібліятэкар расказала прысутным пра птушак, якія насяляюць Беларусь. Асаблівую ўвагу ўдзяліла тым, якія адзначаны ў “Чырвонай кнізе”. Дзеці з ахвотай пазнаёміліся з кнігамі, у якіх апісваецца дзівосны і разнастайны свет птушак, з выставай “Птицы наших лесов и полей”.






**2 красавіка** бібліятэкар **Прудніцкай сельскай бібліятэкі** афарміла **выставу-прынаду “Приключения в стране сказок”**, размясціўшы на вокнах бібліятэкі маляўнічыя дзіцячыя кнігі, якія прыцягваюць маленькіх чытачоў зайсці ў бібліятэку за новай казкай.



**2 красавіка** адзначаецца Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі. У бібліятэках раёна да гэтай значнай падзеі былі падрыхтаваны інфармацыйна-пазнавальныя выставы: **“Россия – Беларусь: общая история, общая судьба” (Езерышчанская гарпасялковая бібліятэка), “Братский союз: Беларусь и Россия” (Даўгапольская сельская бібліятэка), “Вместе мы сила” (Бычіхінская сельская бібліятэка), “Сяброўства народаў” (Віраўлянская сельская бібліятэка)** і інш. На выставах прадстаўлены матэрыялы, прысвечаныя культурнаму і палітычнаму супрацоўніцтву дзвюх краін, гістарычная даведка аб Рэспубліцы Беларусь, мастацкая літаратура беларускіх аўтараў.



**Бычіхінская сельская бібліятэка**




**Даўгапольская сельская бібліятэка**




**Езерышчанская гарпасялковая бібліятэка**



**Віраўлянская сельская бібліятэка**



**2 красавіка** ў рамках праекта “Адкрый для сябе беларускую кнігу” бібліятэкары **Бычыхінскай сельскай бібліятэкі** для вучняў 1-4 класаў ДУА “Бычыхінская сярэдняя школа ім. І.М. Антонава” правялі **літаратурную гульню “Не проста ў словы я гуляю, на роднай мове размаўляю”.** На гэтым мерапрыемстве бібліятэкары расказалі дзецям пра прыгажосць роднай мовы, пра яе мілагучнасць. Дзеці гулялі ў гульні: “Дапоўні прыказку”, “Хуткамоўкі”, “Назаві, што гэта”. У канцы літаратурнай гульні бібліятэкары прапанавалі дзецям больш размаўляць на беларускай мове.



**З 1 па 3 красавіка** супрацоўнік **Дубраўскай сельскай бібліятэкі** правяла для маленькіх чытачоў **акцыю** пад назвай **“Каникулы с книгой”.** Бібліятэкар распавяла дзецям аб тым, што канікулы ¬ гэта найлепшы час каб пазнаёміца з новымі кнігамі і падзяліцца сваімі ўражаннямі аб прачытаным з сябрамі. Наведвальнікам бібліятэкі была прадстаўлена кніжная выкладка, звярнуў увагу на якую кожны меў магчымасць выбраць кнігу на свой густ.




**3 красавіка** ў **Верамееўскай сельскай бібліятэцы** прайшла **бібліямазаіка “Расскажу-ка вам, друзья, что читал сегодня я”**, прысвечаная Тыдню дзіцячай кнігі. Бібліятэкар расказала дзецям пра разнастайнасць кніг, якія ёсць у бібліятэцы, прысутныя выказаліся пра свае літаратурныя густы. Маленькія чытачы даведаліся, што кнігі як караблі ў акіяне ведаў і акіян гэты бязмежны і адправіліся ў падарожжа па астравах. Затым усе разам адправіліся ў падарожжа па астравах: “Элементы кнігі” , “Даведачны” , “Прыказкі”, “Беражлівы”, “Слоўнікі”, “Бібліятэчны”.

**3 красавіка ў Сцепанавіцкай сельскай бібліятэцы** прайшоў **літаратурны калейдаскоп “Приключения на острове книг”.** Каб патрапіць на востраў Кніг дзеці адгадаўшы складаныя заданні, па падказках знайшлі карту і адправіліся ў захапляльнае “падарожжа”. Яны “адправіліся” у заліў Вершаў, пабывалі на рацэ Прыгод, поле Аповяд і “дабраліся” да вострава Кніг, дзе кожны расказаў пра сваю любімую кнігу і атрымаў салодкі падарунак.



**7 красавіка** супрацоўнікі **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** запрасілі выхаванцаў ДУА “Гарадоцкага раённага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі” на **экскурсію “Дом, где живут книги”.** Бібліятэкар расказала дзецям казку: як кнігі пабудавалі дом, сабралі там усе казкі, вершы, дзіцячыя апавяданні і сталі ў ім жыць. Прысутныя з задавальненнем гарталі яркія маляўнічыя кнігі і часопісы, расказвалі на памяць свае любімыя казкі і вершы, пазнаёміліся з кніжнай выставай “Компас в страну здоровья”, прымеркаванай да Сусветнага дня здароўя. А ў канцы мерапрыемства ўсіх удзельнікаў чакаў прыемны сюрпрыз – лялечны спектакль “Как Медведь трубку нашёл”.





**7 красавіка** для навучэнцаў 3 класа ДУА “Езярышчанская сярэдняя школа ім. П. Э. Анціпава” бібліятэкарамі **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэкі** была арганізавана **гадзіна здароўя “Здоровье - мудрых гонорар”,** прымеркаваная да Сусветнага дня здароўя. Падчас мерапрыемства прысутныя падзяліліся ведамі аб здаровым ладзе жыцця, а таксама праверылі свае веды аб правільным харчаванні і гігіене, збіралі прыказкі аб здароўі. Дзеці паказалі некаторыя практыкаванні з ранішняй зарадкі. У завяршэнне мерапрыемства ўсім удзельнікам былі ўручаны вітамінкі.



**7 красавіка** да Сусветнага дня здароўя ў **Руднянскай бібліятэцы-клубе** прайшла **інфармацыйная гадзіна “Защити себя и своих близких”.** Гаворка ішла пра галоўныя правілы здаровага ладу жыцця, такія як: адмова ад шкодных звычак, рацыянальнае харчаванне, актыўны лад жыцця. Таксама карыстальнікам былі прапанаваны кнігі на дадзеныя тэмы з фонду бібліятэкі.

**8 красавіка** бібліятэкар **Сцепанавіцкай сельскай бібліятэкі** запрасіла маленькіх чытачоў на **гульнявы кактэйль “Утром на зарядку – в обязательном порядке”,** прымеркаваны да Сусветнага дня здароўя. Дзеці даведаліся, што такое зарадка, якую карысць яна прыносіць нашаму арганізму. Прысутныя актыўна прымалі ўдзел у рухомых конкурсах і літаратурных віктарынах.



**8 красавіка** супрацоўнік **Прудніцкай сельскай бібліятэкі** правяла для маленькіх карыстальнікаў **гадзіну экаэтыкі "Мы хотим, чтоб от народа не страдала бы природа"**. Бібліятэкар расказала дзецям, что такое экаэтыка, растлумачыла, што трэба з павагай ставіцца да навакольнага асяроддзя і толькі ад паводзінаў кожнага з нас залежыць захаванне прыроды.

**10 красавіка** споўнілася 85 гадоў з дня нараджэння адной з найвядомых рускіх лірычных паэтак другой паловы XX стагоддзя – Бэлы Ахмадулінай. Да гэтай даты была прымеркавана **літаратурная сустрэча "Пра жыццё і творчасць Бэлы Ахмадулінай"**, якая прайшла ў **Бычыхінскай сельскай бібліятэцы**. Яе наведалі навучэнцы старэйшых класаў школы. А бібліятэкар **Межанскай сельскай бібліятэкі 12 красавіка** запрасіла аматараў вершаў у **паэтычны салон "Влечёт меня старинный слог",** прымеркаваны да юбілею Б. Ахмадулінай. Прысутныя пазнаёміліся з біяграфіяй паэткі. Бібліятэкар прадставіла зборнікі вершаў аўтара, якія ёсць у бібліятэцы. На мерапрыемствах гучалі паэтычныя радкі, напісаныя Бэлай Ахмадулінай у чытанні бібліятэкара і гасцей. Для гасцей мерапрыемства былі падрыхтаваны інфармацыйныя буклеты.






**Межанская сельская бібліятэка**

**Бычыхінская сельская бібліятэка**

**13 красавіка** да Міжнароднага дня вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў **у чытальнай зале Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы** прайшоў **урок памяці “Память детства”,** на якім супрацоўнік бібліятэкі расказала навучэнцам 9 класа ДУА “Сярэдняя школа №1 г. Гарадка ім. І. Х. Баграмяна” пра гісторыю ўзнікнення ў нацысцкай Германіі канцэнтрацыйных лагераў, з'яўленні іх на тэрыторыі іншых краін у час Другой сусветнай вайны. Чырвонай ніткай праз усё мерапрыемства прайшла думка аб тым, што толькі захоўваючы памяць аб тых страшных падзеях можна спадзявацца на тое, што падобнае больш ніколі не паўторыцца. Падчас мерапрыемства дэманстравалася відэапрэзентацыя і была прадстаўлена кніжная выстава “Память сердца”.






**15 красавіка ў аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** адбылося **свята смеху “Хто са мною пасябраваў, той ужо не засумуе”.** Конкурсна-гульнявая форма мерапрыемства была абрана не выпадкова, бо дзень смеху неймаверны без жартаў, гумару і розыгрышаў. На свяце выхаванцы ДУА “Яслі-сад №2 г. Гарадка” спаборнічалі ў знаходлівасці, спрыце і кемлівасці, наперабой адгадвалі “Загадки-обманки”, прымалі ўдзел у конкурсе “Нарисуй клоуна”, у вясёлай гульні “Хохотушки”. Вельмі спадабаўся ўдзельнікам конкурс “Мыльные пузыри”.






**17 красавіка** ў **Віраўлянскай сельскай бібліятэцы** было праведзена **свята дзіцячай кнігі “Чудесное путешествие по волшебной стране книг”** для навучэнцаў ДУА “Віраўлянская дзіцячы сад - пачатковая школа”. Бібліятэкар правяла агляд кніжнай выставы “Кніга - крыніца ведаў”. На свята да дзяцей прыйшлі Ліса Аліса і Кот Базіліо, героі кнігі А. Талстога “Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна”. Дзеці ўдзельнічалі ў літаратурных віктарынах, гульнях, успомнілі прыказкі і прымаўкі аб кнігах, пазнаёміліся з правіламі абыходжання з кнігай.

**20 красавіка** для навучэнцаў малодшых класаў ДУА “Сярэдняя школа №1 г. Гарадка ім. І. Х. Баграмяна” работнікі **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** падрыхтавалі **пазнавальна-займальнае падарожжа “Звёздам навстречу”.** Падчас мерапрыемства дзеці даведаліся як на калязямную арбіту быў выведзены першы ў свеце штучны спадарожнік Зямлі, які адкрыў касмічную эру ў гісторыі чалавецтва, імя першага касманаўта планеты Юрыя Гагарына і імя галоўнага канструктара акадэміка Сяргея Паўлавіча Каралева, імёны іншых касманаўтаў якія пакаралі арбіту з пачатку заваявання космасу па сапраўдны дзень. Прысутным быў паказаны відэаролік аб старце касмічнага карабля з першым касманаўтам планеты Юрыям Гагарыным. Для юных чытачоў была аформлена кніжная выстава “Человек открывает землю”, на якой былі прадстаўлены кнігі, якія расказваюць пра планеты, зоркі, галактыкі, каметы. Напрыканцы сустрэчы дзеці з задавальненнем адказвалі на пытанні віктарыны “Что мы знаем о космосе”.





**21 красавіка** для навучэнцаў малодшых класаў ДУА “Межанскі дзіцячы сад – сярэдняя школа імя А.Я. Казлова” бібліятэкар **Межанскай сельскай бібліятэкі** правяла **гадзіну грамадзянска-патрыятычнага выхавання “Мы за Мир!”.** Дзеці разважалі аб тым як важна захоўваць мір на нашай планеце і што Беларусь мірная краіна. Бібліятэкар расказала пра сімвал міру – голуба. Затым усе разам зрабілі плакат, на якім адлюстравалі голуба міру з каляровай паперы і выразалі літары, з якіх склалі назву нашай Радзімы.







**26 красавіка** ў **Даўгапольской сельскай бібліятэцы** была аформлена выстава-рэквіем “Чернобыль – наша боль”, прымеркаваная да Дня Чарнобыльскай трагедыі. Увазе чытачоў была прадстаўлена літаратура, якая адлюстроўвае падзеі тэхнагеннай катастрофы, успаміны непасрэдных сведкаў і ўдзельнікаў ліквідацыі Чарнобыльскай аварыі, погляды лекараў, журналістаў, навукоўцаў на саму аварыю і яе наступствы.



Дзень Светлага Хрыстова Уваскрэсення - вялікае свята хрысціянскай царквы. Да гэтай падзеі ў сельскіх бібліятэках Гарадоцкай сеткі прайшлі разнастайныя мерапрыемства.

**19 красавіка**, напярэдадні Вялікадня ў Прудніцкай сельскай бібліятэцы была аформлена выстава-прагляд народных рэцэптаў. На выстаўцы былі прадстаўлены кнігі і часопісы, з якіх была магчымасць даведацца аб рэцэптах прыгатавання велікодных страў: кулічоў, пасак, пірагоў, булак, пацікавіцца рознымі спосабамі фарбавання яек, вэнджання мяса і інш.

**21 красавіка** ў Дубраўскай сельскай бібліятэцы прайшлі велікодныя вячоркі "Пасха - светлый праздник", на якія былі запрошаны вучні пачатковых класаў. Падчас мерапрыемства дзеці даведаліся пра гісторыю і традыцыі святкавання Вялікадня. Прысутныя актыўна ўдзельнічалі ў гутарцы, расказвалі як адзначаюць Вялікдзень дома. У заключнай частцы ўсе з задавальненнем размалявалі малюнкі велікодных яек.



**24 красавіка** ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы прайшла гадзіна духоўнасці "Вечной Пасхи живительный свет". Бібліятэкар расказала маленькім чытачам пра велікодныя гульні і традыцыі. У канцы мерапрыемства прысутныя пазнаёміліся з кніжнай выставай "Вот и Пасха, запах свечки, запах свежих куличей".



Вялікдзень - гэта таксама адно з самых любімых сямейных святаў. Напярэданні гэтага светлага дня ўдзельнікі бібліятэчнага клуба "Дружная семейка", які працуе пры Межанскай сельскай бібліятэцы, сабраліся на чарговае пасяджэнне "Праздник праздников и торжество торжеств". Разам успомнілі гісторыю свята. Добрыя гаспадыні падзяліліся сваімі рэцэптамі велікодных кулічоў, а дзеці гулялі ў традыцыйныя гульні.

**24 красавіка** на ўрачыстым мерапрыемстве і святочным канцэрце, прысвечаным адкрыццю раённай Дошкі Гонару і святу 1 мая, якое адбылося ў ДУК “Гарадоцкі гарадскі Дом культуры”, супрацоўнікі Гарадоцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі прынялі актыўны ўдзел. Была аформлена пляцоўка, дзе прадстаўлялася выстава-інфармацыя, на якой усе жадаючыя мелі магчымасць убачыць фатаграфіі аб святкаванні 1 мая ў горадзе Гарадку ў розныя гады. Таксама была магчымасць сфатаграфавацца ў тэматычнай фотазоне і праверыць свае веды склаўшы “патрыятычныя лозунгі” на інтэрактыўнай дошцы.








**27 красавіка ў чытальнай зале Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы** ў рамках Кафедры праваслаўнай літаратуры прайшлі **першыя раённыя адукацыйныя Велікодныя чытанні “Чудо выше всех чудес”** сярод навучэнцаў сярэдніх школ Гарадоцкага раёна, арганізатарамі якіх выступілі ДУК “Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк” і аддзел па адукацыі Гарадоцкага раённага выканаўчага камітэта.



Прывітальныя словы да ўдзельнікаў і гасцей прагучалі ад святара храма святой Жываначальнай Тройцы айца Вячаслава. Увазе журы і гасцей мерапрыемства былі прадстаўлены вынікі шматдзённай даследчай дзейнасці навучэнцаў, якая ажыццяўляецца пад кіраўніцтвам навуковых кіраўнікоў-педагогаў агульнаадукацыйных устаноў. Прысутныя з цікавасцю слухалі даклады школьнікаў аб святынях беларускай зямлі, храмах Гарадоччыны: існуючых і зніклых.

Штогод супрацоўнікі Гарадоцкай раённай бібліятэкі ў рамках работы Кафедры праваслаўнай літаратуры сумесна з Гарадоцкім благачыннем напярэданні Вялікадня арганізуюць конкурс дзіцячай прыкладной творчасці “Пасхальное яйцо”. Вынікам конкурсу заўсёды становіцца выстава прадстаўленных работ і ўзнагарода пераможцаў дыпломамі і памятнымі падарункамі. У гэтым годдзе **30 красавіка** ўсіх удзельнікаў конкурса запрасілі на агульнагарадскую **дабрачынную акцыю “На встречу детским сердцам”,** дзе адбылася ўзнагарода. Таксама бібліятэкары ў рамках мерапрыемства прадставілі **выставу-свята “Духовной радости сияние”,** на якой была магчымасць пазнаёміца з кнігамі ў якіх раскрываецца сэнс і значэнне свята Вялікадня, даследчымі работамі ўдзельнікаў Велікодных чытанняў “Чудо выше всех чудес” і творчымі работамі конкурса “Пасхальное яйцо”.



